# Палітыка беларусізацыі

Беларусізацыя – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР ў перыяд 1924-1929 гг. Гэта палітыка праводзілася Камуністычнай партыяй бальшавкоў Беларусі – КП(б)Б і урадам БССР і была накіравана на развіццё культуры Беларусі, беларускай мовы і школы.

У гэтыя гады быў праведзены шэраг мерапрыемстваў:

- дзяржаўнымі мовамі былі абвешчаны адразу чатыры – беларуская, руская, яўрэйская і польская;
- адбываўся перавод навучання ў школах пераважна на беларускую мову (да 1928 г. - каля 80% школ);
- часці Чырвонай Арміі, што размяшчаліся ў Беларусі, пераводзіліся на беларускую мову і камплектаваліся беларусамі;
- мовай справаводства, якой карысталіся служачыя дзяржаўных органаў улады, стала пераважна беларуская;

- наладжваўся выпуск газет, часопісаў, падручнікаў і кніг на беларускай мове;

- было створана ввыдавецтва “Савецкая Беларусь”, адкрыта Беларуская дзяржаўная бібліятэка.



Дзяржаўная бібліятэка

Палітыка беларусізацыі спрыяла <u>ліквідацыі непісьменнасці</u> сярод дарослага насельніцтва. Сталі пісьменнымі каля 200 тыс. дарослых людзей.




Агітацыйны плакат

Пачалася падрыхтоўка спецыялістаў, неабходных для прамысловага развіцця краіны і аднаўлення гаспадаркі, развіццё пачатковай, сярэдняй і вышэйшай адукацыі. У 1921 г. адкрыўся Беларускі дзяржаўны універсітэт (БДУ), у наступным годзе – сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках і ветэрынарны інстытут у Віцебску.



Галоўны корпус БДУ



Акадэмія ў Горках

Ствараліся рабочыя факультэты (рабфакі) для падрыхтоўкі рабоча-сялянскай моладзі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Началося вылучэнне на адказную работу ў партыйныя і савецкія органы ўлады прадстаўнікоў карэннай нацыі, г.зн. беларусаў. Такая палітыка атрымала назву карэнізацыі. Да канца 20-х гг. доля беларусаў у адміністрацыйных установах перавысіла 50%.

Арганізоўвалася навукова-даследчая дзейнасць па ўсебаковым вывучэнні Беларусі. У 1922 г. быў адкрыты Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), ператвораны ў 1929 г. у Беларускую акадэмію навук. Яе ўзначаліў вядомы гісторык Усевалад Ігнатоўскі.



АН БССР



У.Ігнатоўскі




Крыж Ефрасінні Полацкай



В.Ластоўскі

Першымі акадэмікамі сталі Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны. У кіраўніцтве акадэміі быў Вацлаў Ластоўскі, які ў той час з’яўляўся кіраўніком Беларускага дзяржаўнага музея. Ён вярнуўся з-за мяжы пасля амністыі і арганізаваў экспедыцыі па вывучэнні культуры Беларусі, у выніку якіх быў знойдзены крыж Ефрасінні Полацкай.

# У гады беларусізацыі паспяхова развівалася <u>тэатральнае мастацтва.</u>

Пад кіраўніцтвам выдатнага беларускага рэжысёра <u>Е. Міровіча</u> адбывалася станаўленне <u>Першага Беларускага Дзяржаўнага тэатра</u> (БДТ-1), вядомага сёння як Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я.Купалы.



БДТ-1



Трупа Беларускага дзяржаўнага тэатра



Тэатр імя Я.Коласа

У Віцебску дзейнічаў БДТ-2 (цяпер Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я.Коласа). У той час там працавала выдатная актрыса С.Станюта.



У.Галубок

Узнік незвычайны тэатр – Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр (БДТ-3) пад кіраўніцтвам Уладзіслава Галубка. Тэатр праіснаваў 17 гадоў і ўвесь час карыстаўся вялікім поспехам у гледачоў.

Значныя поспехі былі дасягнуты ў развіцці беларускай літаратуры. У 20-я гг. былі апублікаваны паэмы “Новая зямля” і “Сымон-музыка”, у якіх Я.Колас адлюстраваў жыццё, працу і духоўны свет простых людзей дарэвалюцыйнай Беларусі. Выйшла другая частка трылогіі Я. Коласа “На ростанях” – аповесць “У глыбі Палесся”. Менавіта ў гэты перыяд урад БССР прысвоіў Я.Купалу і Я.Коласу ганаровыя званні народных паэтаў Беларусі.



Я.Колас і Я.Купала

У гэты час з’явіліся творы маладых беларускіх пісьменнікаў М.Чарота, К.Чорнага, М.Лынькова, К.Крапівы і інш.



Кадр з фільма “Лясная быль”

У гады беларусізацыі адбывалася станаўленне беларускага савецкага кіно. У 1926 г. па матывах аповесці М.Чарота “Свінапас” быў створаны першы беларускі мастацкі героіка-патрыятычны фільм аб грамадзянскай вайне “Лясная быль”.

Яго рэжысёр Юрый Тарыч унёс вялікі ўклад у развіццё кінематографа. У 1928 г. у Ленінградзе адкрылася кінастудыя мастацкіх фільмаў “Савецкая Беларусь” (з 1939 г. – у Мінску, з 1946 г. называецца “Беларусьфільм).



Ю.Тарыч

Перыяд беларусізацыі аказаўся вельмі кароткім. Змена палітычнага курсу, звязаная з адмовай ад нэпа, прывяла да спынення палітыкі беларусізацыі.

# “Культурная рэвалюцыя ”




Развіццё культуры Беларусі ў канцы 1920-х – 30-я гг. атрымала назву “культурнай рэвалюцыі”. У яе выніку была ліквідавана непісьменнасць, уведзена ўсеагульнае і абавязковае пачатковае, а затым і сямігадовае навучанне.



М.Лынькоў

У галіне літаратуры адным з лепшых твораў стала аповесць Я.Коласа “Дрыгва”, прысвечаная дзеду талашу. М.Гарэцкі напісаў раманы-хронікі “Камароўская хроніка” і “Віленскія камунары”. М.Лыньковым была створана аповесць “Міколка-паравоз”, а Я.Маўрам – “Палескія рабінзоны”.

Важнай падзеяй у галіне музычнага мастацтва стала адкрыццё ў 1932 г. Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.



У 1937-38 гг. была заснавана Беларуская дзяржаўная філармонія.



Праз год пачаў дзейнічаць Беларускі тэатр оперы і балета.



У 30-я гг. былі створаны вядомыя беларускія оперы “У пушчах палесся” А.Багатырова, “Кветка шчасця” А.Туранкова, першы нацыянальны балет “Салавей” М.Крошнера.

Беларускія мастакі В.Волкаў, Я.Зайцаў стваралі карціны, галоўным чынам прысвечаныя рэвалюцыйным падзеям і ўстанаўленню савецкай улады, героіцы грамадзянскай вайны і мірнага будаўніцтва.



У.Корш-Саблін

Беларускі кінематограф стаў гукавым. У гэты час з'яўляюцца фільмы для дзяцей, экранізуюцца літаратурныя творы. Пануючай з'яўляецца тэматыка, звязаная з будаўніцтвам у рэспубліцы сацыялізму. Развіццё беларускага кіно было звязана з імем славутага рэжысёра У.Корш-Сабліна.

Развіццё архітэктуры значна змяніла знешняе аблічча гарадоў. Па праектах архітэктара І.Лангбарда і яз яго удзелам у Мінску былі пабудаваны Дом урада, Дом Чырвонай Арміі, галоўны корпус Акадэміі навук, Дом Саветаў у Магілёве. Ва ўнутраным афармленні Дома ўрада прымалі ўдзел скульптары З.Азгур, А. Бембель.



Дом Чырвонай Арміі



Дом урада

У галіне літаратуры і мастацтва ўлады праводзілі ў жыццё <u>прынцып сацыялістычнага рэалізму</u>. Згодна з ім адбывалася ідэалізацыя рэвалюцыйных падзей і існуючага ў краіне грамадскага ладу. Савецкі чалавек стаў паказвацца як творца і гаспадар новага жыцця. Адлюстроўваліся пераважна падзеі сацыялістычнага будаўніцтва. А творчасць тых дзеячаў культуры, якія не прытрымліваліся гэтага прынцыпу, была абмежавана, іх культурныя ўстановы, напрыклад, тэатр У. Галубка, расфарміраваны.

Супярэчлівасці ў развіцці культуры праявіліся ў палітыцы абмежавання выкарыстання беларускай мовы. У <u>1933 г</u>. была праведзена <u>рэформа беларускага правапісу</u>, у выніку якой беларуская мова было набліжана да рускай.



АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Антыдзяржаўнай практыцы—сакрушальны адпор. У барацьбе за пралетарскі інтэрнацыяналізм.

Аб рабоце лёгкай прамысловасці Беларусі—з выступленьня народнага камісара лёгкай прамысловасці СССР тав. ЛЮБІМАВА на партнарадзе гаспадарнікаў лёгкай прамысловасці БССР.

ЗА-МЯЖОЙ.

Тэрор супроць рэвалюцыйнага руху.

Япона-маньчжурскія войскі акупавалі Гуань.

Моладзь капіталістычных краін рыхтуецца да 19-га МЮДу.

Прыезд Эрыё у СССР.

# АБ ЗЬМЕНАХ І СПРАШЧЭНЬНІ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ

## ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла вялізарныя магчымасці для паспяховага развіцця беларускай культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зместу. Беларуская мова з пагарджанай стала роўнапраўнай...

3. Перад пачатковымі націскнымі галоснымі «о», «у» заўсёды пісаць «в», за выключэньнем геаграфічных назваў (восень, вучань, вобраз, але Орша, Ула). Перад ненаціскным «у» пісаць...

...кон, Алтай, Балтыка, Балканы, малекула, фабула, формула, аэраплан, бланк, клас, лацет, лафет, план, плятінт, платформа, пракламацыя, фланг, апладысменты, блок, глобус...

...бітаў: Васіль або Базыль, Осіп або Язэп, Іван або Янка, Міхаіл, Міхал або Міхась.

МАРФАЛЁГІЯ.